# ПЕРШАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# АБ ПАЛЯПШЭННІ БЫТАВОГА АБСЛУГОЎВАННЯ НАСЕЛЬНІЦТВА РЭСПУБЛІКІ

## *Даклад Старшыні Савета Міністраў БССР дэпутата Ц. Я. КІСЯЛЁВА*

Таварышы дэпутаты! Першая сесія Вярхоўнага Савета БССР шостага склікання сабралася ў абстаноўцы, калі наша сацыялістычная Радзіма знаходзіцца на новым магутным уздыме. Савецкі народ з вялікім натхненнем працуе над ажыццяўленнем прынятай XXII з'ездам Праграмы КПСС. У барацьбе за пабудову камунізма працоўныя нашай краіны яшчэ мацней згуртаваліся вакол слаўнай Камуністычнай партыі і ленінскага Цэнтральнага Камітэта. Яркай дэманстрацыяй маналітнага адзінства партыі і народа з'явіліся прайшоўшыя ў гэтым месяцы выбары ў Вярхоўныя і мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных саюзных рэспублік. Вынікі выбараў бяспрэчна сведчаць аб усенародным адабрэнні і падтрымцы палітыкі Камуністычнай партыі, якая вырашае кроўныя інтарэсы працоўнага народа і праслаўнута вялікай ідэяй камунізма — усё ў імя чалавека, для шчасця чалавека.

За апошнія гады партыя, па-ленінску смела ламаючы аджыўшыя арганізацыйныя формы, рашуча пераадольваючы вынікі культу асобы Сталіна, няўхільна ўдасканальвае формы і метады кіраўніцтва народнай гаспадаркай. Праведзены рашэнні і меры, якія адкрылі шырокую прастору росту прадукцыйных сіл нашага грамадства, развіццю ініцыятывы і творчай актыўнасці мас.

Героічнай працай савецкага народа створана магутная і ўсебакова развітая эканоміка. Толькі за чатыры гады сямігодкі ўведзена ў дзеянне больш як 3.700 буйных прамысловых прадпрыемстваў. Гэта значыць, што кожны дзень уступалі ў строй 2—3 буйных прадпрыемствы. Прамысловая вытворчасць за гэты час павялічылася на 45 працэнтаў. Цяпер у нашай краіне толькі за 8 дзён выпускаецца прадукцыі больш, чым было выпушчана за ўвесь 1913 год. Адзін месяц у машынабудаванні роўны дарэвалюцыйнаму году. Электраэнергіі выпрацоўваецца цяпер за двое сутак больш, колькі ў дарэвалюцыйнай Расіі выпрацоўвалі за цэлы год.

Сур'ёзныя поспехі дасягнуты і ў сельскай гаспадарцы. У мінулым годзе вытворчасць збожжа ў краіне дасягнула звыш 8 мільярдаў пудоў супраць 5 мільярдаў пудоў у 1953 годзе. Павялічылася вытворчасць мяса, малака, яек і іншых прадуктаў.

Разам з усёй краінай па шляху ўздыму ідзе і Беларусь. За гады сямігодкі прамысловасці рэспублікі прадугледжвалася павялічыць на 58 працэнтаў, сямігодкай жа нам прадугледжвалася павялічыць на 37 працэнтаў. Звыш плана выпушчана прадукцыі больш чым на 1 мільярд рублёў. Многія вырабы прамысловых прадпрыемстваў рэспублікі шырока вядомы не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі. Больш чым у 50 зарубежных краін экспартуецца прадукцыя, якая выпускаецца прадпрыемствамі Беларусі.

Аб тэмпах развіцця эканомікі рэспублікі сведчаць такія даныя. У народную гаспадарку БССР за чатыры гады сямігодкі ўкладзена 2,7 мільярда рублёў. Гэта значна больш, чым было ўкладзена за чацвёртую і пятую пяцігодкі, разам узятыя. За гэты час уведзена ў дзеянне больш як 160 новых прадпрыемстваў і цэхаў, у тым ліку Бярозаўская і Васілевіцкая электрастанцыі, газаправоды Дашава—Мінск і Шчорс—Гомель, завод аўтаматычных ліній у Мінску, Беларускі аўтамабільны завод у Жодзіна і іншыя. Шырокім фронтам ажыццяўляецца будаўніцтва буйнейшага ў Еўропе Полацкага нафтаперапрацоўчага завода, двух салігорскіх калійных камбінатаў, Светлагорскага завода штучнага валакна, Мінскага маторнага завода, Гродзенскага азотнатукавага завода, Баранавіцкага баваўнянага камбіната і іншых буйных аб'ектаў.

Далейшае развіццё атрымала і сельская гаспадарка. Значна палепшана структура пасяўных плошчаў, расшыраны пасевы збожжавых, бабовых культур, цукровых буракоў, кукурузы. Узрасло пагалоўе рагатай жывёлы, вытворчасць мяса за чатыры гады сямігодкі павялічылася на 47 тысяч тон, малака—на 758 тысяч тон, яек—на 142 мільёны штук. Аднак паказчыкі сельскагаспадарчай вытворчасці ў рэспубліцы [illegible] за запланаваныя [illegible]. Пленум ЦК КП Беларусі, які толькі што адбыўся, у адпаведнасці з запіскай таварыша М. С. Хрушчова разгледзеў і прыняў пастанову аб далейшай спецыялізацыі сельскай гаспадаркі рэспублікі, што адыгрывае важную ролю ў развіцці эканомікі калгасаў і саўгасаў.

На аснове росту эканомікі краіны ўсямерна павышаецца дабрабыт савецкіх людзей. За апошнія гады павялічана зарплата нізкааплатным рабочым і служачым, павышаны пенсіі, зменшаны падаткі, устаноўлены 7 і 6-гадзінны рабочы дзень, дзяржава забяспечвае студэнтаў стыпендыямі, пастаянна клапоціцца аб дзецях і жанчынах-маці.

За мінулы год насельніцтва рэспублікі атрымала з грамадскага фонду на народную асвету, медыцынскае абслугоўванне, сацыяльнае забеспячэнне і розныя выплаты і льготы, апрача заработнай платы, 818 мільёнаў рублёў.

Новыя, яшчэ больш шырокія магчымасці для далейшага развіцця савецкай эканомікі адкрываюць рашэнні лістападаўскага Пленума ЦК КПСС (1962 г.).

Перабудова партыйнага кіраўніцтва прамысловасцю, будаўніцтвам і сельскай гаспадаркай па вытворчаму прынцыпу і адпаведная перабудова савецкіх, прафсаюзных і камсамольскіх органаў стварыла яшчэ больш спрыяльныя ўмовы для таго, каб сканцэнтраваць усе сілы партыі і народа на вырашэнні галоўнай задачы камуністычнага будаўніцтва—стварэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма, забеспячэнні багацця матэрыяльных і духоўных даброт для народа.

У сістэме мер па далейшаму ўздыму дабрабыту насельніцтва вялікае месца займае бытавое абслугоўванне.

«Пытанні бытавога абслугоўвання—гэта не дробязі, не другарадныя рэчы,—гаварыў М. С. Хрушчоў на XXII з'ездзе КПСС.—Ад таго, наколькі ўладкаван быт чалавека, якая культура абслугоўвання, у многім залежыць і настрой людзей і прадукцыйнасць іх працы».

Партыя і ўрад пастаянна клапоцяцца аб далейшым удасканаленні службы быту з тым, каб яна адпавядала ўсё ўзрастаючым патрэбам савецкіх людзей.

Цэнтральны Камітэт Кампартыі Беларусі і Савет Міністраў рэспублікі ўдзяляюць штодзённую ўвагу гэтым пытанням. За апошні час праведзена значная работа па развіццю сеткі прадпрыемстваў, арганізацыі новых відаў і форм бытавога абслугоўвання. Аднак мясцовыя Саветы, міністэрствы, ведамствы дапускаюць яшчэ ў гэтай справе нямала недахопаў.

Улічваючы велізарныя задачы, пастаўленыя рашэннямі XXII з'езда КПСС і Праграмай партыі па далейшаму ўздыму дабрабыту народа, задавальненню матэрыяльных і духоўных запатрабаванняў савецкіх людзей, Савет Міністраў БССР уносіць пытанне аб паляпшэнні бытавога абслугоўвання насельніцтва рэспублікі на разгляд гэтай сесіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

## КЛОПАТЫ АБ ДАБРАБЫЦЕ НАРОДА—ВЫШЭЙ ЗА ЎСЁ

Дазвольце, таварышы дэпутаты, коратка далажыць вам, што зроблена па паляпшэнню бытавога абслугоўвання насельніцтва, якія недахопы маюцца, якія меры нам трэба будзе ажыццявіць у бліжэйшыя гады.

Бытавым абслугоўваннем насельніцтва ў нас займаюцца многія арганізацыі, але асноўны аб'ём работ выконваюць Галоўнае ўпраўленне бытавога абслугоўвання і мясцовай прамысловасці пры Савеце Міністраў БССР, Белкаапсаюз, Міністэрства гандлю, Галоўнае ўпраўленне камунальнай гаспадаркі пры Савеце Міністраў БССР.

За мінулыя 4 гады ў рэспубліцы дадаткова адкрыта звыш [illegible] розных спецыялізаваных фабрык, камбінатаў, атэлье, стацыянарных і перасоўных прыёмных пунктаў па рамонту розных прадметаў хатняга ўжытку.

Так, Галоўным упраўленнем бытавога абслугоўвання і мясцовай прамысловасці ўведзена ў дзеянне 1.585 прадпрыемстваў, у тым ліку 196 камбінатаў бытавога абслугоўвання з комплексам майстэрняў і прыёмных пунктаў па розных відах паслуг, 8 фабрык па хімчыстцы і фарбаванню адзення, 9 механізаваных фабрык па рамонту абутку і іншых спецыялізаваных прадпрыемстваў. Да канца сямігодкі будзе ўведзена ў эксплуатацыю 627 атэлье, майстэрняў і прыёмных пунктаў, больш за 70 камбінатаў бытавога абслугоўвання.

Спажывецкая кааперацыя значна расшырыла сетку прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання ў сельскай мясцовасці. На 1959 год майстэрань у сельскай мясцовасці было [illegible]. Да канца сямігодкі іх будзе налічвацца 2.200 прадпрыемстваў па абслугоўванню насельніцтва па розных відах паслуг і ў тым ліку 519 новых камбінатаў бытавога абслугоўвання.

Усяго на пачатак гэтага года ў рэспубліцы дзейнічае звыш 7.000 прадпрыемстваў службы бытавога абслугоўвання, у тым ліку—3.326 у сельскай мясцовасці. У 1965 годзе такіх прадпрыемстваў будзе 8.980, з іх у вёсцы—4.800. Для тэхнічнага аснашчэння прадпрыемстваў асвоены выпуск розных відаў абсталявання, транспартных сродкаў. Фабрыкі хімчысткі і фарбавання адзення, рамонту абутку, майстэрні па рамонту складанай бытавой тэхнікі забяспечаны найноўшым абсталяваннем.

Больш увагі надаецца далейшаму аб'яднанню і спецыялізацыі прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання.

Аб'ём работ па бытавых паслугах, выдача насельніцтву рэчаў напракат, прыём заказаў па месцу работы і пражывання, перасоўныя майстэрні і прыёмныя пункты, дамавыя пральні і іншыя формы, якія працуюць на самаабслугоўванні.

У рэспубліцы ёсць нямала ўзорных майстэрань, камбінатаў бытавога абслугоўвання. Вопыт іх работы трэба не толькі прапагандаваць, але і актыўна ўкараняць. Многа добрых слоў можна пачуць ад наведвальнікаў аб рабоце фабрыкі «Рамабутак» у горадзе Мінску (дырэктар тав. Кантаровіч), швейнай майстэрні Мінскага гарадскога і Баранавіцкага спажывецкага таварыства, Аршанскага раёна (загадчык тав. Герасімава), Старобінскага камбіната бытавога абслугоўвання (дырэктар тав. Спірын) і многіх іншых.

Вядома, і на гэтых прадпрыемствах не ўсё ў парадку, працаваць можна значна лепш.

Старобінскім камбінатам бытавога абслугоўвання ў 1962 годзе адкрыта 9 новых майстэрань па індывідуальнай пашыўцы і рамонту абутку, рамонту металабытавых вырабаў і трыкатажу. Пачалося будаўніцтва швейнага атэлье. Арганізаваны перасоўны прыёмны пункт, які абслугоўвае 19 пасёлкаў. У гэтым годзе адкрыт другі пункт.

План 1962 года перавыканан па ўсіх відах паслуг, за выключэннем індывідуальнай пашыўкі абутку. План абслугоўвання сельскага насельніцтва выканан на 170 працэнтаў. Аб'ём бытавых паслуг у параўнанні з 1961 годам павялічыўся на адну трэць. Прадпрыемства стала рэнтабельнае. Тут часта праводзяцца выстаўкі работ майстэрань, вывучаюцца заўвагі, скаргі і прапановы насельніцтва.

Яшчэ рана ацэньваць работу бюро бытавых паслуг, бо яны толькі створаны ў некаторых гарадах, але ясна ўжо, што насельніцтва станоўча адносіцца да гэтай новай формы абслугоўвання. Так, Мінскае бюро бытавых паслуг за першыя тры месяцы сваёй работы выканала каля дзвюх тысяч заказаў ад насельніцтва па ўборцы кватэр, націранню падлог, догляду дзяцей, дастаўцы прамысловых і харчовых тавараў і г. д.

Поле дзейнасці бюро неабмежаванае, прычым для аказання многіх відаў паслуг не патрабуецца вялікіх матэрыялаў. Трэба, каб ва ўсіх гарадах рэспублікі былі створаны такія бюро і каб узначалілі іх ініцыятыўныя людзі.

Больш увагі трэба ўдзяляць выхаванню кадраў, занятых бытавым абслугоўваннем насельніцтва на ўсіх прадпрыемствах службы быту.

Як бачыце, таварышы дэпутаты, зроблена многае. І ўсё ж на сённяшні дзень стан бытавога абслугоўвання далёка не задавальняе ўзрослых патрэб насельніцтва, не адпавядае сучасным патрабаванням і наяўным матэрыяльным і тэхнічным магчымасцям.

У бытавым абслугоўванні ёсць сур'ёзныя недахопы і памылкі. Яны тлумачацца перш за ўсё тым, што ў радзе выпадкаў савецкія, гаспадарчыя органы і перш за ўсё тыя міністэрствы і ведамствы, якім даручана гэтым займацца, недаацэньваюць гэты важны ўчастак, не забяспечваюць практычна паспяховае вырашэнне пастаўленых задач, не выкарыстоўваюць наяўныя спрыяльныя ўмовы, магчымасці і рэзервы.

Нам неабходна значна расшырыць сетку прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання ў гарадах і асабліва ў сельскай мясцовасці.

На расшырэнне сеткі выдзяляюцца вялікія сродкі. Аднак будаўнічыя арганізацыі і ведамствы асвойваюць іх не поўнасцю, не выконваюць планаў будаўніцтва бытавых прадпрыемстваў, відаць, лічаць іх другараднымі аб'ектамі. Так, у 1962 годзе па Гомельскай вобласці гэтыя сродкі былі асвоены толькі на 62 працэнты, Мінскай—на 71 працэнт, а па горадзе Мінску асвоена толькі 69 працэнтаў выдзеленых сродкаў.

Усяго па Галоўнаму ўпраўленню бытавога абслугоўвання і мясцовай прамысловасці пры Савеце Міністраў БССР за апошнія чатыры гады недаасвоена на будаўніцтва прамысловых прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання каля 1,4 мільёна рублёў, або 14,5 працэнта выдзеленых на гэтыя мэты сродкаў. Не поўнасцю асвойваюць асігнаванні і іншыя ведамствы. У выніку гэтага на 1 студзеня 1963 года ўстаноўленае заданне па расшырэнню сеткі недавыканана на 344 прадпрыемствах, у асноўным у сельскай мясцовасці.

Больш таго, ёсць нямала фактаў, калі памяшканні, пабудаваныя для бытавога абслугоўвання, выкарыстоўваюцца не па прызначэнню.

Выканкомам абласных, гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў працоўных неабходна ўважліва разгледзець наяўнасць і размяшчэнне прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання і знайсці магчымасць адкрыць новыя і выкарыстаць па прызначэнню памяшканні, занятыя цяпер для іншых мэт. Неабходна поўнасцю асвойваць сродкі і своечасова ўводзіць у дзеянне бытавыя прадпрыемствы.

ных бытавых машын і прыбораў, трыкатажных вырабаў, галантарэі і культтавараў, мала фатаграфій, дрэнна арганізаван рамонт кватэр. У гарадах Брэсце і Гродна, напрыклад, ёсць толькі па адной мэблевай майстэрні, у горадзе Жлобіне, дзе жыве 20 тысяч насельніцтва, ёсць толькі адна фатаграфія.

Чаму мірацца з гэтым старшыні Брэсцкага і Гродзенскага гарвыканкомаў тт. Пятроў і Ушацкі, старшыня Жлобінскага райвыканкома тав. Рабцаў?

План работ па бытавому абслугоўванню насельніцтва ў мінулым годзе выканан па рэспубліцы толькі на 94,1 працэнта. Галоўнае ўпраўленне бытавога абслугоўвання і мясцовай прамысловасці пры Савеце Міністраў БССР, выканаўшы план у цэлым, заданне па аказанню прамысловых відаў паслуг выканала толькі на 97,2 працэнта.

Асабліва дрэнна справіўся з заданнем па аказанню бытавых паслуг Белкаапсаюз (старшыня тав. Абраменка), выканаўшы план толькі на 57 працэнтаў. Трэба зазначыць, што Белкаапсаюз не зрабіў вывадаў з вынікаў работы мінулага года і план студзеня—лютага г. г. выканаў толькі на 53 працэнты. Не справіліся з заданнем 1962 года па бытавому абслугоўванню Міністэрства гандлю, Галоўнае ўпраўленне аўтамабільнага транспарту.

Вельмі нясмела і марудна ўкараняюцца новыя формы бытавога абслугоўвання насельніцтва і перш за ўсё такія, як прыём заказаў на даму, па месцу работы—на прадпрыемствах і ва ўстановах.

Ад насельніцтва паступае многа скаргаў на нясвоечасовае выкананне заказаў, на нізкую якасць работ, на нежаданне аказваць тыя ці іншыя паслугі.

Калі кіраўнікам міністэрстваў і ведамстваў задаеш пытанне, чаму ад насельніцтва паступае так многа скаргаў, у адказ, як правіла, чуеш: у нас яшчэ не хапае прадпрыемстваў.

Як я ўжо адзначыў, сетка прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання ў рэспубліцы яшчэ недастатковая. Але ці ў гэтым усё зло? Вядома, не. У рэспубліцы цяпер, як ужо было сказана, звыш сямі тысяч бытавых прадпрыемстваў. Гэта не так ужо і мала. Але чаго сапраўды часта не хапае многім кіраўнікам і работнікам службы быту, дык гэта перш за ўсё любоўных адносін да справы, добрасумленнага выканання сваіх абавязкаў.

Хіба можна растлумачыць нейкімі аб'ектыўнымі прычынамі той факт, што на Мінскай фабрыцы індывідуальнай пашыўкі абутку, дзе дырэктарам тав. Каспяровіч, у 1962 годзе з-за недабраякаснай работы адмовіліся ад заказаў 1.500 чалавек, або кожны дваццаты з заказчыкаў. Грамадзянка Тумакова заказала ў атэлье туфлі і басаножкі. Пасля неаднаразовага наведвання атэлье заказ быў выкананы, але пераблыталі размер абутку, і давялося паўтарыць заказ. Зноў прыйшлося не раз прыходзіць, а вынікі—туфлі пашыты на розныя калодкі—адзін туфель аднаго размеру і фасону, а другі іншага фасону і размеру.

Чым іншым, як не адсутнасцю парадку на гэтай фабрыцы можна растлумачыць такі недапушчальны факт?

У мэблевае атэлье Мінскай фабрыкі імя Дзімітрава (дырэктар тав. Петрашэўскі) паступіла за год 100 скаргаў на нізкую якасць, 145 чалавек зусім адмовіліся ад сваіх заказаў.

На працягу некалькіх гадоў паступаюць скаргі на дрэнную работу Віцебскай фабрыкі хімчысткі і фарбавання адзення. Фабрыка не мае ніводнага добра абсталяванага прыёмнага пункта. Рэчы дастаўляюцца пасля чысткі ў скрынках навалам, здаюцца заказчыкам з плямамі, дрэнна адпрасаваныя, парушаюцца тэрміны выканання заказаў, многія рэчы даводзіцца афарбоўваць паўторна.

Або вось такія прыклады. Тав. Кірыенка з Буда-Кашалёўскага раёна вырашыў да зімы пакрыць паўсукном свой кажушок. Першага кастрычніка 1962 года ён аднёс яго ў майстэрню прамкамбіната і вось ужо на двары вясна, а заказ так і не выканан. Відаць, пасля сесіі старшыня райвыканкома тав. Галкін дапаможа заказчыку хоць бы к лету атрымаць кажух.

Амаль год (са студзеня па лістапад 1962 г.) чакала грамадзянка Пястун, пакуль ёй пашыюць жаночае зімовае паліто ў швейнай майстэрні Крычаўскага прамкамбіната, але так і не дачакалася. Паліто было безнадзейна сапсавана.

Грамадзянін Красільнікаў здаў гадзіннік у рамонт у цэнтральную майстэрню па Камуністычнай вуліцы ў г. Мінску. Тут яму растлумачылі, што ў механізме знаходзіцца выпадкова трапіўшы вінт, і за рамонт узялі 3 рублі. Праз некалькі месяцаў гадзіннік зноў спыніўся, і ў той жа майстэрні яму зноў сказалі, што перашкаджае вінт: узялі за рамонт 1 рубель 15 капеек. Прайшло крыху часу, гадзіннік зноў спыніўся. І трэці раз прыёмшчык растлумачыў, што «ў гадзінніку лішні вінт», за што яшчэ раз заказчык заплаціў грошы. Нам думаецца, што зусім развінціліся кіраўнікі гэтай майстэрні.

што яны на прадпрыемстве або ў рабочым пасёлку адкрылі жаночую цырульню? Дарэчы, у Мінску намячалася адкрыць 13 жаночых цырульняў непасрэдна на прадпрыемствах і ў ВНУ. Аднак да гэтага часу ніводная з іх не адкрыта.

З такімі фактамі можна сустрэцца і ў іншых галінах быту. Кіраўнікі прамысловых прадпрыемстваў і будоўляў не маюць права стаяць у баку ад пытанняў быту рабочых і служачых. Яны павінны зрабіць усё, каб стварыць ім неабходныя ўмовы, паклапаціцца аб расшырэнні сеткі і нармальнай рабоце лазняў, душавых, сталовых, буфетаў, магазінаў, майстэрань бытавога абслугоўвання і г. д.

Нам неабходна ўмацоўваць матэрыяльна-тэхнічную базу прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання, больш выдзяляць абсталявання, інструменту, інвентару, запасных частак і матэрыялаў. Скаргі наконт гэтага ад кіраўнікоў прадпрыемстваў і ведамстваў справядлівыя. Многа важных пытанняў матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, арганізацыі працы, планавання ў сістэме бытавога абслугоўвання ўзнята работнікамі службы быту ў газеце «Советская Белоруссия» за 24 сакавіка. Савет Міністраў разгледзіць гэтыя пытанні. Але ўжо і так ясна, што ў планах забеспячэння трэба прадугледжваць забеспячэнне патрэб бытавых прадпрыемстваў у сыравіне, матэрыялах, абсталяванні і транспартных сродках у адпаведнасці з устаноўленым аб'ёмам работ, а таксама ў будаўнічых матэрыялах для рамонту кватэр і для будаўніцтва новых прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання. Трэба, каб і кіраўнікі бытавых прадпрыемстваў праяўлялі больш ініцыятывы і актыўнасці ў гэтай справе.

## ЖЫЛЛЁВАЕ І КАМУНАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА

У вялікіх маштабах у рэспубліцы вядзецца жыллёвае і камунальнае будаўніцтва, добраўпарадкоўваюцца гарады і рабочыя пасёлкі, расшыраецца сетка культурна-асветных устаноў.

За шэсць гадоў, якія прайшлі пасля рашэння ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР аб развіцці жыллёвага будаўніцтва, працоўныя нашай рэспублікі атрымалі толькі за кошт дзяржаўных сродкаў каля 7 мільёнаў квадратных метраў жылля. Гэта значна больш усяго наяўнага жылога фонду нашых абласных цэнтраў—Брэста, Віцебска, Гомеля, Гродна і Магілёва, разам узятых. Акрамя таго, сельскім насельніцтвам, а таксама рабочымі і служачымі ў гарадах і рабочых пасёлках пабудавана 262,5 тысячы дамоў.

Аднак патрэбнасць у жыллі яшчэ вялікая. Значная колькасць рабочых, служачых, калгаснікаў мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Між тым, у жыллёвым будаўніцтве ёсць яшчэ сур'ёзныя недахопы. Магчымасці, дадзеныя нам дзяржавай, выкарыстоўваюцца не поўнасцю. Хоць у цэлым па рэспубліцы план 1962 года быў выкананы, міністэрствы асветы і сельскай гаспадаркі, Галоўнае ўпраўленне камунальнай гаспадаркі, Мінскі і Брэсцкі аблвыканкомы не ўвялі ў эксплуатацыю 22,8 тысячы квадратных метраў жылой плошчы. А гэта ж, таварышы, прыкладна 700 кватэр. Не поўнасцю асвойваюцца капіталаўкладанні на жыллёвае будаўніцтва і ў гэтым годзе.

Нельга мірыцца з такім становішчам. Неабходна павысіць адказнасць кіраўнікоў будаўнічых арганізацый, міністэрстваў і ведамстваў, узмацніць кантроль мясцовых Саветаў і ўсёй грамадскасці за будаўніцтвам жылля, дабівацца павышэння тэмпаў, паляпшэння якасці будаўніцтва, своечасовай здачы пад засяленне кожнага жылога дома.

Заслугоўвае сур'ёзнай увагі пытанне аб паляпшэнні планавання і комплекснай забудовы з улікам патрэбнасці насельніцтва ў школах, дзіцячых і медыцынскіх установах, прадпрыемствах бытавога абслугоўвання, гандлю, грамадскага харчавання і г. д., гэта значыць усяго таго, што неабходна для стварэння нармальных бытавых умоў для працоўных. Трэба таксама, каб новыя раёны былі добра звязаны транспартнымі сродкамі як з цэнтрам, так і з месцам работы жыхароў.

Партыя і ўрад аказваюць таксама ўсямерную дапамогу рабочым і служачым у індывідуальным і кааператыўным будаўніцтве жылля, выдзяляючы на гэтыя мэты грашовыя пазыкі, будаўнічыя матэрыялы. Аднак з году ў год мы не выкарыстоўваем адпускаемых пазык.

Між тым, магчымасці і выгада кааператыўнага будаўніцтва яўна недаацэньваюцца. Толькі ў Мінску арганізаваны 32 кааператывы і ў Гомелі—7 кааператываў. У астатніх жа абласных цэнтрах, у буйных гарадах і на прамысловых прадпрыемствах работа ў гэтым напрамку праводзіцца недастаткова. Трэба больш актыўна ствараць жыллёвыя кааператывы і выканаць прадугледжаны планам аб'ём жыллёвага будаўніцтва. Гэта вялікі рэзерв, і яго трэба поўнасцю выкарыстаць.

Важна не толькі пабудаваць, але і правільна размеркаваць жыллё. На жаль, у нас яшчэ дапускаюцца парушэнні ўстаноўленага парадку, прынцыпу чарговасці, першачарговага забеспячэння жыллём тых, хто мае ў ім крайнюю патрэбу. Такія факты не павінны мець месца. Выканкомы мясцовых Саветаў і прафсаюзныя арганізацыі абавязаны строга прытрымлівацца ўстаноўленага парадку. Трэба ўзмацніць грамадскі кантроль за правільным размеркаваннем кватэр.

Як ужо было сказана, вялікі размах набыло будаўніцтва жылля і ў сельскай мясцовасці. За пасляваенныя гады ў вёсцы абноўлена амаль палавіна жылога фонду. Але работы наперадзе яшчэ шмат.

ЦК КП Беларусі і Саветам Міністраў БССР распрацаваны канкрэтныя меры па паляпшэнню будаўніцтва і рамонту жылых дамоў у сельскай мясцовасці, у прыватнасці, пастаўлена задача ажыццявіць у бліжэйшыя гады паступовы пераход да будаўніцтва шматкватэрных добраўпарадкаваных жылых дамоў з вогнетрывалых матэрыялаў, што значна палепшыць умовы быту сельскага насельніцтва.

Праўленні многіх калгасаў па-баявому ўзяліся за выкананне гэтай пастановы, будуюць дамы сіламі і за сродкі калгасаў, ствараюць грамадскі жылы фонд, а таксама дапамагаюць у будаўніцтве дамоў калгаснікам.

У калгасе «Іскра» Калінкавіцкага раёна будаўніцтва і рамонт дамоў калгаснікаў вядуцца па плану спецыяльнай калгаснай будаўнічай брыгадай. У 1962 годзе тут пабудавана 15 і адрамантаваны 32 дамы, з удзелам калгаснікаў складзены план будаўніцтва і рамонту дамоў на 1963 год.

Калгас імя Фрунзе Брагінскага раёна на працягу двух гадоў пабудаваў і перадаў у растэрміноўку калгаснікам 44 цагляныя дамы.

Добрую ініцыятыву праявілі праўленне і партыйная арганізацыя калгаса «Кастрычнік» Хойніцкага раёна. За сродкі калгаса тут завяршаюць будаўніцтва 16 цагляных тыпавых дамоў на новай вуліцы.

Калгас «Слава працы» Слонімскага раёна праз міжкалгасную будаўнічую арганізацыю пабудаваў 16-кватэрны жылы дом і побач заклаў фундамент новага шматкватэрнага дома. Калгас імя Калініна Нясвіжскага раёна за свае сродкі будуе пяць двухпавярховых чатырохкватэрных жылых дамоў.

Можна было б прывесці многа прыкладаў умелай арганізацыі будаўніцтва жылля ў радзе гаспадарак Віцебскай вобласці.

Гэты вопыт павінен атрымаць шырокае распаўсюджанне ва ўсіх калгасах і саўгасах рэспублікі. Трэба мець на ўвазе, што калгаснікам і рабочым саўгасаў будаваць дамы з цэглы сваімі сіламі і сродкамі без дапамогі праўленняў калгасаў, дырэкцый саўгасаў і міжкалгасных будаўнічых арганізацый, скажам прама, не заўсёды пад сілу.

На жаль, некаторыя мясцовыя Саветы, праўленні калгасаў, кіраўнікі саўгасаў стаяць у баку ад гэтай важнай справы, не праяўляюць належных клопатаў аб будаўніцтве жылля для калгаснікаў і рабочых саўгасаў.

Пастанова ЦК КПБ і Савета Міністраў «Аб паляпшэнні будаўніцтва і рамонту жылых дамоў у сельскай мясцовасці» ў радзе месц выконваецца нездавальняюча.

Брэсцкі, Камянецкі, Бярозаўскі і Пінскі райвыканкомы доўгі час нават не абмяркоўвалі гэту пастанову, а некаторыя работнікі райвыканкомаў аднесліся да яе фармальна, па-бюракратычнаму. Намеснік старшыні Пінскага райвыканкома тав. Сіняўскі гэту пастанову 27 ліпеня 1962 года накіраваў інжынеру райвыканкома па будаўніцтву ў калгасах тав. Раманенку з рэзалюцыяй: «Падрыхтуйце адпаведную пастанову бюро ГК КПБ і выканкома райсавета па гэтаму пытанню». Праз месяц, 20 жніўня, старшыня райвыканкома тав. Мінкевіч пастанову абкома КПБ і аблвыканкома па гэтаму ж пытанню накіраваў ужо іншым выканаўцам—інжынеру па дарожнаму будаўніцтву і старшыні райплана — з рэзалюцыяй: «Падрыхтуйце праект пастановы». Два кіраўнікі склалі рэзалюцыі і супакоіліся. Мінула больш як паўгода, а іх указанні так і павіслі ў паветры.

Брэсцкі аблвыканкам, цяпер сельскі, нездавальняюча арганізоўвае выкананне гэтага рашэння. Старшыня аблвыканкома тав. Луцкін можа сказаць, за што вы нас крытыкуеце? Пастанову ЦК і Савета Міністраў мы абмеркавалі на выканкоме, на сесіі, прынялі рашэнні, далі ўказанні на месцы. Усё гэта правільна. Але аблвыканком гэтым і абмежаваўся, слаба праводзіць канкрэтную арганізатарскую работу. У многіх калгасах і сельскіх Саветах вобласці планы жыллёвага будаўніцтва на 1962 — 1965 гг. і меры дапамогі сем'ям калгаснікаў у будаўніцтве і рамонце дамоў не распрацаваны, і па сутнасці гэта важная справа пушчана на самацёк.

Брэсцкая вобласць не з'яўляецца выключэннем. Нямала сур'ёзных недахопаў дапускаецца ў будаўніцтве жылля ў Мінскай, Магілёўскай і іншых абласцях. Трэба навесці належны парадак у размеркаванні матэрыялаў. Часам будаўнічыя матэрыялы выдзяляюцца і дапамога аказваецца тым сем'ям, у якіх дамы ў добрым або ў здавальняючым стане, а сем'і, якія жывуць у дамах, што маюць патрэбу ў рамонце, дапамогі не атрымліваюць.

Нам трэба значна ўзмацніць тэмпы будаўніцтва жылля ў сельскай мясцовасці, весці яго з належным дзяржаўным размахам, да канца ліквідаваўшы наяўны самацёк і неўмяшанне з боку мясцовых Саветаў, калгасаў, саўгасаў.

Наперадзе вялікая работа па далейшай электрыфікацыі сельскай мясцовасці. За мінулыя гады сямігодкі расход электраэнергіі на душу сельскага насельніцтва ўзрос у 3 разы. Тым не менш электраэнергіяй забяспечваюцца яшчэ далёка не ўсе двары калгаснікаў і рабочых саўгасаў.

Да канца сямігодкі будзе электрыфікавана яшчэ звыш 400 тысяч дамоў сельскага насельніцтва, г. зн. электрыфікацыя вёскі будзе ў асноўным завершана. Задача гэта не лёгкая, але яе можна выканаць, і яна будзе выканана.

## РАМОНТ ЖЫЛЛЯ, БУДАЎНІЦТВА ДЗІЦЯЧЫХ УСТАНОЎ

З павелічэннем жыллёвага фонду рэспублікі ўзрастае адказнасць мясцовых Саветаў, міністэрстваў і ведамстваў за правільную эксплуатацыю жылых дамоў, за своечасовы і высакаякасны рамонт іх.

За апошні час прынят рад мер па паляпшэнню эксплуатацыі, капітальнага і бягучага рамонту жылога фонду мясцовых Саветаў. Аб'яднаны дробныя рамонтна-будаўнічыя канторы. Ствараецца вытворчая база, якая забяспечвае рамонтныя канторы зборнымі канструкцыямі, будаўнічымі дэталямі з дрэва і бетону. Шырэй укараняецца механізацыя. Усё гэта стварыла ўмовы для павелічэння аб'ёмаў, паляпшэння якасці, скарачэння тэрміну і зніжэння кошту рамонту.

Аднак капітальны і бягучы рамонт, эксплуатацыя жылых будынкаў арганізаваны яшчэ нездавальняюча. Сродкі і матэрыялы, якія выдзяляюцца на капітальны рамонт жылых дамоў, нярэдка распыляюцца па шматлікіх аб'ектах, а ў радзе выпадкаў выкарыстоўваюцца не па прызначэнню.

З гэтым далей мірыцца нельга. Выканкомы мясцовых Саветаў, кі-

тацыі жылога фонду, добраўпарадкаванні і азеляненні двароў і вуліц. Выканкомы мясцовых Саветаў павінны ўсямерна падтрымліваць гэту ініцыятыву, развіваць яе.

У той жа час выклікае горкую крыўду і абурэнне, калі бачыш, як з-за безадказных адносін да эксплуатацыі многія жылыя дамы разбураюцца, выходзяць са строю, а кіраўнікі выканкомаў, прадпрыемстваў абыякава глядзяць на гэта, не прымаюць ніякіх мер. У запушчаным стане знаходзяцца многія дамы ў Магілёве, Віцебску, Мінску і іншых гарадах. А трэба мець на ўвазе, што толькі адзін працэнт выхаду са строю жылога фонду раней тэрміну складае па рэспубліцы больш як 11 мільёнаў рублёў.

Неабходна больш увагі ўдзяляць пытанням рамонту жылога фонду індывідуальных забудоўшчыкаў як у горадзе, так і ў вёсцы, а таксама аказанню дапамогі ў бягучым рамонце кватэр за кошт сродкаў кватэранаймальнікаў. Галоўнае ўпраўленне бытавога абслугоўвання і мясцовай прамысловасці пры Савеце Міністраў БССР і

толькі 4 працэнты агульнага вытворчага плана камбіната. Хоць камбінат і носіць назву «Бытавых паслуг», асноўная яго дзейнасць зводзіцца да правядзення розных работ для арганізацый і ўстаноў. Ад жыхароў горада паступае многа скаргаў на тое, што ім адмаўляюць у просьбе адрамантаваць кватэру, а калі заяўкі і прымаюцца, то тэрміны рамонту вельмі вялікія, а якасць нізкая. Вось што піша ў сваёй скарзе на работу камбіната «Бытпаслугі» жыхар горада Мінска Мядзведзеў: «З 3 па 31 мая 1962 г. хадзіў я ў гэты камбінат і выклікаў спецыяліста для вызначэння аб'ёму работ і яго кошту, пасля чаго заплаціў аванс. А затым..? На працягу паўтара месяца хадзіў і літаральна выбіваў, каб прыслалі майстра выканаць заказ. Але нічога не выйшла. Калі б была на гэта ўважлівая прычына, а то ж ніякай прычыны няма». Пасля ўсіх гэтых пакут грамадзянін Мядзведзеў адмовіўся ад заказу і забраў аванс. Тав. Мядзведзеў просіць дапамагчы разабрацца, што гэта за камбінат «Бытпаслугі», чаму ён так назы-

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы